УДК 37(476)(091)“16”

# ПАЛЕМІКА ВАКОЛ МЭТАЗГОДНАСЦІ ДЗЕЙНАСЦІ БРАЦКІХ ШКОЛ НА БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПАЧАТКУ XVII СТ

***Андрэй Самусік***
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі вывучаецца палеміка вакол дзейнасці на беларуска-ўкраінскіх землях брацкіх школ. Аналізуюцца прычыны канфлікту паміж праваслаўнымі царкоўнымі іерархамі і брацтвамі. Разглядаецца крытыка брацкай педагагічнай мадэлі з кансерватыўнага пункту погляду І. Вішэнскага, незадаволенага найперш перавагай свецкай састаўляючай вучэбнага працэсу над духоўна-маралізатарскім выхаваннем моладзі. На прыкладзе зместу “Перасторогі” паказана пазіцыя брацкіх школ, якія ў дадзеным творы абвяшчаліся галоўнымі абаронцамі праваслаўя ад наступу каталіцкай царквы. Адзначана далейшае пераадоленне рознагалоссяў і выпрацоўка кампрамісных падыходаў да функцыянавання праваслаўных адукацыйных асяродкаў

***Ключавыя словы: брацкія школы, гуманістычныя навацыі, кансерватыўны светапогляд, палемічныя творы, І. Вішэнскі, “Перасторога”***

У канцы XVI – пачатку XVII ст. праваслаўнае насельніцтва ўкраінска-беларускіх земляў здолела стварыць уласную сістэму адукацыю ў выглядзе сеткі брацкіх школ,

буйнешыя з якіх дзейнічалі ў Вільні, Львове, Брэсце, Луцку, Магілёве, Кіеве, Мінску, Перамышле і інш. Іх кіраўніцтва імкнулася заручыцца падтрымкай як мага большай часткі адзінаверцаў, а таму ўсяляк падкрэслівала сваю вернасць хрысціянскім дагматам [10, с. 124-125].

Разам з тым, той факт, што ініцыятыва ў арганізацыі брацкіх школ належыла свецкім колам, а таксама дамінаванне ў вучэбных праграмах гуманістычных ідэй, прывяло да значнай крытыцы іх дзейнасці з боку кансерватыўна настроенага духавенства. Яны даказвалі, што пазнаць Бога разумам не магчыма, бо ірацыянальнае не вывучаецца рацыянальным спосабам. Аб небяспецы ж падобных эксперыментаў сведчылі, згодна з іх меркаваннямі, спробы каталіцкай царквы праз падтрымку гуманізму адаптавацца да развіцця навукі і педагогікі, вынікам чаго і стала Рэфармацыя [4, с. 73]. Дарэвалюцыйны гісторык К. Харламповіч так апісваў тагачасную сітуацыю: “С самого начала существования братств чувствовалась неестественность заведывания мирянами религиозно-просветительными учреждениями. Невольно возникало при этом опасение, что миряне-заправилы впадут в ересь и при своем значении вовлекут в нее массы народа, особенно путем школьного воспитания, где и сами новые науки способны были отчуждать детей от православия” [12, с. 284].

Не дзіўна таму, што імкненне мірян да асветы выклікала рэзкі супраціў часткі святароў: “хулящих и возбраняющих учения” [7, с. 169]. Выдатна дэманструе гэта і канфлікт Львоўскага брацтва з мясцовым епіскапам Г. Балабанам у 1588-1590 гг. Апошні катэгарычна заяўляў: “Гэта д’ябальскае брацтва, д’ябал яго вам паставіў і зацвердзіў, і ад д’ябла яго маеце” [1, арк. 1-3]. Прычым пазіцыя яго была бескампраміснай: “О науке вам, простым людям, спрашивать не годится”. Аргумент жа братчыкаў наконт таго, што апостал Павел заклікаў вучыцца быў ім катэгарычна адхілены: “Стану я учить тебя, только что вылезшего из навоза! Что тебе до Писания?”. Вынікам гэтага канфлікта, дарэчы, стала адмова часткі львоўскіх мяшчан дасылаць уласных дзяцей у брацкую школу, бо лічылі, што вучоба тут для іх будзе “пустым, растленным и малопотребным” [8, с. 182].

Вельмі негатыўна ставіўся да складаўшайся ў Рэчы Паспалітай у пачатку XVII ст. сістэмы праваслаўнай асветы вядомы тагачасны пісьменнік-палеміст і царкоўны дзеяч І. Вішэнскі. Сам ён у маладосці не атрымаў школьнай адукацыі – пісаў, што граматычных дробязей не вучыў, рытарычных цацак не бачыў, нічога філасофскага мудрагелістага не чуў. У выніку, зыходзячы з уласнага жыццёвага вопыту, першынства ён аддаваў самаадукацыі: “И не может никто никого врачевати албо учити, если наперед себя не уздоровит и не научит…”. Прычым, згодна з яго разважаннямі, свецкія навукі ўводзяць людзей ад пазнання Бога і накіроўваюць іх да “прелести” зямнога свету і якраз у гэтым іх галоўны недахоп, бо рэлігійныя веды павінны быць перашаснымі: “И не ведомость хулю художества, але хулю, што теперешние наши новые русские философы не знают в церкви ничтоже читати – ни тое самое Псалтыри, ни Часослова…” [6 , с. 373]. Ідэальным жа для І. Вішэнскага было навучанне дзяцей выключна: “граматики богомольного и праведнословного часословия” [11, с. 144].

У творы “Аб памылках Рымскай веры” ён раскрыў уласнае бачанне дасканалай адукацыі: “Остави сие образование мечтательное и толкование, от художества и учения силогизм поганских изобретенное, но дай ми простую веру соборное и апостолское церкви, голым и сущим писаниемъ апостол преданую и отъ перваго собора изображенную…”. Далей аўтар адзначаў, што “Латинник” папракае праваслаўнага ў неадукаванасці: “Где ся сей учил? Полатине не знает, простое евангелие четет, комедии и машкар у езуитских колемах (*калегіўмах* – А.С.) не учив… Но он убо многими языки и поганскими даскалы (*дыдаскалы ці настаўнікі* – А.С.), Платоном, Аристотелем и прочими прелести их последующими да ся хвалит и возносит; ты же простый, неученный и смиренный Русине, простого и нехитрого евангелия ся крепко держи, в нем же живот вечный тебе сокровенное есть…” [3, с. 257]. Дадаць да гэтага можна цытату з іншага твора І. Вішэнскага – “Пасланні ўсім праваслаўным жыхарам Паўднёва-Заходняй Русі і Польска-Літоўскага каралеўства”. У ім ён асуджаў складаўшуюся сітуацыю ў апошнім: “Вместо зась евангелской проповеди, апостолской науки и святых закона… ныне



Репозиторий ПолесГУ

поганские учители, Аристотели, Платоны и другие тым подобные машкарники а комидийники в дворех Христа Бога владеют…” [3, с. 225].

У пачатку XVII ст. І. Вішэнскі пабываў у Львоўскай брацкай школе і нават падараваў ёй “Кронику о Грецком панстве” на царкоўнаславянскай мове [9, с. 31]. Аднак, у “Послание к старице Доминикии” ён раскрытыкаваў дзейнасць гэтай навучальнай установы, заявіўшы, што тутэйшыя выхаванцы вывучаюць толькі “риторские байки” і не здольны належным чынам усхваляць Бога, а таксама не ведаюць царкоўнай службы [5, с. 262]. Не падабалася яму і арганізацыя ў ёй вучэбна-выхаваўчага працэсу: “Не знают в церкви ничтоже читати, ни тое самое псалтири, ни часослова… Латынских басней ученицы… только комедии строят и играют” [13, с. 180].

Ва ўласным жа “Пасланні князю Астрожскаму і да ўсіх праваслаўных хрысціян у Малай Расіі” ён заклікаў у адукацыі сканцэнтравацца на галоўным: “Книги церковные все и уставы Словенским языком (*царкоўна-славянскім* – А.С.) друкуйте: сказую бо вам тайну великую, яко диавол толикую зависть имает на Словенский язык… и што некоторые наши на Словенский язык хулят и не любят… А то для того диавол на Словенский язык борбу тую мает, занеже есть плодоноснейший отъ всех языков и Богу любимийший: понеже без поганских хитростей и руководств, се же есть, кграматик, риторик, диалектик и прочиихъ их коварств тщеславных, диавола вместных, простым прилежным читанием, без всякаго ухищрения, к Богу приводит…” [3, с. 210]. У гэтым жа творы, дарэчы, І. Вішэнскі яшчэ раз прадэманстраваў уласную бескампрамісную пазіцыю і падкрэслены кансерватызм у звароце непасрэдна да праслаўшагася дабрачыннымі ды асветнымі справамі магната: “Чи не лепше было свете присносущнаго разума, православной церкви дарованный, видети, нежели нине в тме поганских наук затворитися и умрети? …Чи не лепше тобе изучити часословец, псалтыр, охтоих, апостол и евангелие… и быти простым богоугодником и жизнь вечную получити, нежели постигнути Аристотеля и Платона и философом мудрым ся в жизни сей звати, и в геену отъити? Разсуди! Мил ся видитъ – лепше есть ани аза знати, толко бы до Христа ся дотиснути…” [3, с. 207, 210].

Своеасаблівым адказам І. Вішэнскаму стаў ананімны гісторыка-палемічны трактат “Перастарога” (каля 1605 г.), аўтарства якога прыпісваецца настаўніку латыні ў Львоўскай брацкай школе І. Барэцкаму (у далейшым кіеўскі мітрапаліт), альбо тутэйшаму заможнаму мяшчаніну Ю. Рагацінцу – аднаму са заснавальнікаў азначанай навучальнай установы. У дадзеным творы адзначаўся культурны заняпад праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай, што прывяло да ўзмацнення яе канкурэнтаў: “Были великие ревнители, иж много з великим коштом церквей и монастырей намуровали… книг великое множество языком Словенским нанесли, но однако того, што было напотребнейшее школ посполитых не фундовали… и так то велми много зашкодило панству Рускому, же не могли школ и наук посполитых расширяти, и оных не фундовано: бо коли бы были науку мели, тогды бы за неведомостию своею не пришли до таковые погибели. Читаючи кроники Польские знайдеш о том достаточно, як Поляци Руские панства пообседали… свое обычаи оздобные и науку укоренили, так, иж Русь посполитовавшися з ними, позавидели их обычаем, их мове и наукам, и, не маючи своих наук, у науки Римские свое дети давати почали: которые з науками и веры их навыкли, и так по малу-малу науками своими все панство Руское до веры Римской привели…” [2, с. 204-205].

Выратавальнікамі праваслаўя аўтар лічыў кн. К.(В.)К. Астрожскага, а таксама грэчаскіх патрыярхаў: “Благоверный князь Константин Константинович, в святом крещении нареченный Василий, княжа Острозкое… збудовал школу… Словенскую и Грецкую у Острогу заложил друкарню… За чим православие наше почало было просиявати яко солнце: люди учоные почали были в церкви Божией показоватися, учители и строители церкви Божией и книги друкованые почали множитися… А наконец, святейший патриарх Иоаким Антиохийский первый, а потом Константинопольский Иеремия в землю Рускую приехали… и братства у местах постановили… которые потом король Стефан… привилиями умоцнил: и на тых только теперь благочестие уже зостало. Тот же и во Львове науки вызволеные, языка

Словенского и Грецкого Грамматику выдруковати подал, и чрез митрополита Елассонского и Димониского Арсения чрез два лета учил; порядки в церкве Божией екземпляры Грецкими правдивыми подавал и на Словенский язык перевести и выдруковати казал… и тогды в друкарни Грецкого и Солвенского писма розмножилося: чого негды в Руском народе не бывало. Яко ся окрестили, и не училися, только церкви будовали, которые им злые суседи зараз поспустошвали… а великих панов своими науками и способами розмаитыми от церкви выведено… про то теперь школы на всех местех закладаются…” [2, с. 205-207, 222-223]. Такім чынам, бачна, што ў “Перастарогі” заснавальнікамі і апекунамі брацкіх школ абвяшчаліся вышэйшыя праваслаўныя іерархі, што павінно было абараніць іх ад нападкаў з боку кансерватараў-адзінаверцаў.

Вельмі ганарыўся аўтар асветніцкамі поспехамі Віленскай брацкай школы, якая: “в купе зостало, маючи при собе геретиков, которых им Господь Бог заступцами дал. И в том гонении чим больш гонимы и преследованы были, тем больше моц Божия над ними оказовалася, а братство множилося, школа росла, людей з ней ученых много и казнодеев мудрых выходит. И так мужаются и укрепляются, посреди волков невредимы суть… Его превратити не могут от православия, ни огонь, ни меч, але тым барзей Бог их подкрепляет, так, иж в них знайдутся люде учоные, годные, терпеливые, смиренномудрые…” [2, с. 215, 235].

Разам з тым, адсутнасць адзінства ў адносінах да брацкіх школ у самім праваслаўным грамадстве, зразумела, не спрыяла ўмацаванню іх пазіцый у Рэчы Паспалітай, дзе з аднаго боку хутка пашыралася колькасць езуіцкіх навучальных устаноў, а з другога – усё больш умацоўвалася ўніяцкая царква, якая менавіта ў гэты час пачала прэтэндаваць на ўступленне ва ўласнасць тымі праваслаўнымі манастырамі, пры якіх дзейнічалі брацкія школы. У такіх умовах толькі агульныя намаганні свецкіх ды рэлігійных колаў былі здольны спыніць знішчэнне апошніх праваслаўных асветніцкіх асяродкаў на беларуска-украінскіх землях. Пошук кампрамісу пачаўся з канца 1620-х гг. пры кіеўскім мітрапаліце П. Магіле. Ён стварыў дакладную сістэму кіравання асветай – усе школы былі падначалены настаяцелям мясцовых манастыроў, але дзейнічалі яны з улікам пажаданняў брацтваў і кантраляваліся Кіева-Магілянскім калегіўмам. Апошні рыхтаваў настаўнікаў, якія менавіта на гэтай пасадзе распачыналі сваю царкоўную кар’еру. Такім чынам быў выпрацаваны агульны напрамак вучэбнага працэсу ў школах, улічваўшы розныя погляды на яго арганізацыю і праіснаваўшы ажно да канца XVIII ст.


1. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Львове (ЦДГАУ ў Львове). – Ф. 129. Воп. 1. Спр. 76.
2. Акты, относящиеся к истории Западной Руси, собранные и изданные Археографической комиссией : в 5 т. – СПб., 1846-1853. – Т 4 : 1588-1632 гг. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1851. – VIII, 529 с.
3. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной Руси : в 15 т. – СПб., 1863-1892. – Т. 2 : 1599-1637 гг. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1865. – 287 с.
4. Бондарчук, Я.В. Духовний подвиг “блаженної пам’яті великого старця” Івана Вишенського / Я.В. Бондарчук // Наукові записки Національного університету “Острозька академія”. – Серія : Історичне релігієзнавство. – 2012. – Вип. 6. – С. 64-75.
5. Вишенский, И. Сочинения / И. Вишенский. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1955. – 372 с.
6. Вишенський, І. Твори / І. Вишенський / пер. В. Шевчука. – Київ: Дніпро, 1986. – 247 с.
7. Ісаєвич, Я. Братства та їх роль в розвитку української культури XVI-XVII століття / Я. Ісаєвич. – Київ : Наукова думка, 1966. – 252 с.
8. Лукашова, С.С. Миряне и Церковь : религиозные братства Киевской митрополии в конце XVI века / С.С. Лукашова. – М. : Ин-т славяноведения РАН, 2006. – 320 с.
9. Пам’ятки братських шкіл на Україні (кінець XVI – початок XVII ст.) / пад рэд. В.І. Шинкарука [та ін.]. – Київ : Наукова думка, 1988. – 568 с.
10. Самусік, А.Ф. Паміж “septem artes liberalis” і “studia humanitatis” : трансфармацыя еўрапейскай адукацыі ў XIV – XVI стст. / А.Ф. Самусік // Studia Historica Europae Orientalis : Исследования по истории Восточной Европы : сб. научн. ст. – Вып. 4 / под ред. А.В. Мартынюка. – Минск : РИВШ, 2011. – С. 108-126.

11. Твердохліб, А. Роль Івана (Іова) Борецького в становленні та розвитку Львівської братської школи / А. Твердохліб // Педагогічні науки : зб. наук. пр. – Полтава: Вид-во ПНПУ, 2013. – Вип. 2. – С. 142-146.
12. Харлампович, К. Западнорусскія православныя школы XVI и начала XVII века / К. Харлампович. – Казань : Типо-литография Имп. Университета, 1898. – 586 с.
13. Шустова, Ю.Э. Документы Львовского Успенского Ставропигийского братства (1586-1788) : Источниковедческое исследование / Ю.Э. Шустова. – М. : Рукописные памятники Древней Руси, 2009. – 648 с.

## THE CONTROVERSY AROUND THE ADVISABILITY OF ACTIVITY FRATERNAL SCHOOLS IN THE UKRAINIAN-BELARUSIAN LANDS IN THE EARLY XVII CENTURY

***Andrej F. Samusik***
*Candidate of Historical Sciences, Dozent, Belarus State Economic University, Minsk, Belarus*
a.f.samusik@gmail.com

**Summary:** For the first time in the national historiography studied the controversy surrounding the activities on the Belarusian-Ukrainian lands of fraternal schools. The reasons of the conflict between the Orthodox Church hierarchy and brotherhood. We consider the criticism of fraternal teaching model with a conservative point of view I. Vishenski dissatisfied primarily predominance of secular component of the educational process of spiritual and moralistic upbringing of youth. On the example of the content of "Perastarogi" indicates the position of fraternal schools, which in this work were proclaimed the main defender of orthodoxy from the onset of the Catholic Church. It is noted further elaboration overcoming differences and compromise approaches to the operation of orthodox educational environments

***Keywords: fraternal school, humanistic innovations, conservative outlook, polemical, I. Vishenski, "Perastaroga"***

Репозиторий ПолесГУ